Серыя «УРОКІ: ПРАКТЫЧНЫ ВОПЫТ»

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## ПЛАНЫ-КАНСПЕКТЫ ЎРОКАЎ

## 8 клас

**(II паўгоддзе)**

Дапаможнік для педагогаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі

Мазыр
«Выснова»
2021

# Прадмова

Прапанаваныя ў метадычным дапаможніку планы-канспекты ўрокаў складзены ў адпаведнасці з дзеючымі вучэбнымі праграмамі для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджанымі Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Сваім зместам вучэбнае выданне цалкам адпавядае метадычным патрабаванням да выкладання прадмета.

Мэта дапаможніка — максімальна палегчыць падрыхтоўку настаўніка да ўрока ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі да арганізацыі адукацыйнага працэсу па беларускай мове.

У дапаможніку рэалізуюцца патрабаванні адукацыйнага стандарту па прадмеце, вызначаецца паслядоўнасць урокаў, у тым ліку ўрокаў развіцця маўлення. Размеркаванне вучэбнага матэрыялу прыводзіцца ў адпаведнасці са зместам і структурай вучэбнага дапаможніка (*Бадзевіч, З. І.* Беларуская мова: вучэб. дапам. для 8 класа ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з бел. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2020), а таксама каляндарна-тэматычным планаваннем на 2020/2021 навучальны год (С. А. Язерская, І. М. Саматыя, І. М. Слесарава, П. І. Лявонава).

Дапаможнік уключае 37 распрацовак урокаў розных тыпаў; тэксты для правядзення кантрольных работ, матэрыялы для ўрокаў развіцця мовы. План-канспект урока з'яўляецца вынікам творчага пошуку, накіраванага на рэалізацыю развіваючых, навучальных, выхаваўчых мэтаў урока ў асобна ўзятым класе.

У дапаможніку прапанаваны заданні, якія стымулююць пазнавальную актыўнасць вучняў, іх самастойную вучэбную дзейнасць: заданні праблемнага і даследчага характару, дыскусійнага матэрыялу, пытанняў і заданняў, якія патрабуюць самастойнага пошуку інфармацыі, яе выкарыстання для выканання вучэбных і практычных задач; пытанні і заданні для самаправеркі засваення вучэбнага матэрыялу; заданні, якія патрабуюць прымянення засвоеных ведаў, уменняў і навыкаў, а таксама асабістага вопыту для рашэння вучэбных і практычных задач. Прапанаваны разнастайныя віды работ на ўроку: работа з тэкстам, тэставыя заданні, складанне модуляў, кластараў па тэме, інтэрактыўныя заданні (спасылкі на learningapps.org), складанне і расшыфроўка воблака слоў, ментальных карт; спасылкі QR-кодаў на анлайн-слоўнікі з тлумачэннем слоў і выразаў.

Безумоўна, матэрыял неабходна выкарыстоўваць творча, улічваючы псіхалагічныя асаблівасці вучняў, а таксама іх здольнасць успрымаць вучэбны матэрыял.

## УРОК за кошт рэзервовых гадзін

# Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле «Аднасастаўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне»

**Мэты**: падагульніць і сістэматызаваць веды пра аднасастаўныя сказы; удасканальваць уменні адрозніваць віды аднасастаўных сказаў па сэнсавых і граматычных прыметах, аднасастаўныя і двухсастаўныя сказы; выяўляць сэнсава-стылістычную ролю аднасастаўных сказаў.

**Тып урока**: сістэматызацыя ведаў.

**Абсталяванне**: [1; 2]; табліцы; малюнак да рэфлексіі; тэст; рабочы аркуш.

## Ход урока

### I. Арганізацыйны момант. Псіхалагічны настрой

— Давайце настроімся на працу і ўсміхнёмся адзін аднаму. Я рада бачыць вашы ўсмешкі і думаю, што сённяшні ўрок прынясе нам усім радасць ад працы. На ўроку вы будзеце працаваць з рабочым аркушам, які падрыхтаваны для кожнага з вас.

### II. Праверка дамашняга задання

***Практ. 211.*** Сінтаксічны разбор сказаў.

Нельга жыць без веры ў людзей. (безасабовы) З песні слова не выкінеш. (абагульнена-асабовы) Холадна. (безасабовы) Чыгунка. Бераг ракі. Жоўтая палоска пяску. (назыўны) Перш за ўсё пачалі перапраўляць раненых. (няпэўна-асабовы) Не злічыш дароў тваіх, верасень, сёлета. (абагульнена-асабовы)

*Яшчэ* — прыслоўе; *жоўтая* — прыметнік; *раненых* — дзеепрыслоўе.

Вучні запаўняюць табліцу (можна прапанаваць запоўніць асобныя графы табліцы).

| ВЫКАЗНІК | | | | ДЗЕЙНІК |
|---|---|---|---|---|
| **пэўна-асабовыя** | **няпэўна-асабовыя** | **абагульнена-асабовыя** | **безасабовыя** | **назыўныя** |
| Дзеяслоў у форме 1-й і 2-й асобы цяперашняга ці будучага часу абвеснага ці загаднага ладу | Дзеяслоў у форме 3-й асобы множнага ліку цяперашняга ці будучага часу або ў форме прошлага часу множнага ліку | Дзеяслоў у форме 2-й асобы абвеснага ці загаднага ладу | Дзеянне і стан не ўтвараюцца дзейнай асобай | Назоўнік у назоўным склоне |

**III. Актуалізацыя апорных ведаў. Мэтавызначэнне**

— Сёння на ўроку падвядзём вынікі па тэме «Аднасастаўныя сказы».

— Суаднясіце часткі фраз:

| | |
|---|---|
| *На ўроку я сістэматызую веды...* | пра галоўныя члены сказа і форму іх выражэння ў аднасастаўных сказах |
| *Паўтару...* | парадак сінтаксічнага разбору аднасастаўнага сказа |
| *Выканаю...* | прапанаваныя заданні і практыкаванні |

**IV. Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага**

— Прапаную вам для аналізу выказванні класікаў беларускай літаратуры. Прачытайце іх і вызначце тып сказаў.

| Прыклад | Тып сказа |
|---|---|
| Яно добра, а нават і трэба знаць суседскую мову, але найперш трэба знаць сваю. (Францішак Багушэвіч) | Безасабовы |
| Любіце і шануйце, як святыню, роднае слова, з якім вас літасцівы Бог на свет пусціў. (Францішак Скарына) | Пэўна-асабовы |
| Ніякае багацце людзей не бывае даражэйшым за іх родную мову. (Якуб Колас) | Двухсастаўны |

— Наша мова багатая на сінонімы. Але сінонімамі могуць быць не толькі словы, але і сказы: адну і тую ж думку можна выказаць па-рознаму. Да прапанаваных сказаў падбярыце сінанімічныя,

пры гэтым абавязкова аднасастаўныя. Падкрэсліце граматычную аснову кожнага сказа, вызначце тып аднасастаўных.

У з о р. Ён адчуваў сябе спакойна. — Яму было спакойна. (безасабовы)

| | | |
|---|---|---|
| У лесе стаіць цішыня. | У лесе цішыня. | Назыўны |
| Пад вечар пачаў крапчэць мароз. | Пад вечар пачало падмарожваць. | Безасабовы |
| Я вельмі шкадую, што так атрымалася. | Вельмі шкадую, прабач. | Пэўна-асабовы |
| Настаўнікі рэкамендуюць абавязкова чытаць услых. | Рэкамендуюць абавязкова чытаць услых. | Няпэўна-асабовы |
| Твая работа роблена наспех і зроблена насмех. | Роблена наспех і зроблена насмех. | Абагульнена-асабовы |

**Работа з тэкстам**

Вучні працуюць з рабочым аркушам: чытаюць тэкст, устаўляюць прапушчаныя літары, графічна пазначаюць арфаграмы, падкрэсліваюць граматычныя асновы сказаў, вызначаюць іх тып.

Бывай, абуджаная сэрцам (5), дарагая.
Чаму так горка, не магу я зразумець.
*Шкада заранкі мне (безасабовы)*, што ў небе дагарае
На ўсходзе (2) дня майго, якому ружавець.

*Ці помніш першае нясмелае (3) прызнанне*?.. (пэўна-асабовы)
Над намі жаўранкам звінеў (3) і плакаў май.
*Назаўтра золкае, туманнае (4) світанне,*
*Суровы позірк твой і мой нямы адчай* (1). (назыўны)

1 — правапіс прыставак, якія заканчваюцца на ***б*** і ***д***, 2 — правапіс ***з/с*** у прыстаўках; 3 — суседняя мяккасць; 4 — падваенне; 5 — правапіс некаторых спалучэнняў зычных.

— Сапраўдны духоўны скарб беларусаў — вусная народная творчасць. Давайце звернемся да прыказак, гэтай крыніцы мудрасці, «школы жыцця», што пакінулі нам продкі.

— Закончыце прыказкі. Вызначце, чым выражаны галоўны член сказа. Растлумачце сэнс падкрэсленых прыказак. Вызначце тып аднасастаўных сказаў.

| | |
|---|---|
| Людзей слухай, а (свой розум май). (*Хоць чыя-небудзь парада і не зашкодзіць, але трэба трымацца сваіх поглядаў, быць самастойным у сваіх дзеяннях, учынках.*) | Думай звечара, а (рабі зрання). (*Перш, чым прыняць рашэнне, яго трэба абдумаць.*) |
| Маной свет пройдзеш, а (назад не вернешся). (*Няпраўда недаўгавечная, несумленнасцю многага не даб'ешся. Кажуць з асуджэннем пра таго, хто жыве падманам.*) | Выказанага слова (да губы не вернеш). (*Перш, чым сказаць, падумай*). |

**Фізкультхвілінка**

**Творчая работа**

— Напішыце сачыненне-мініяцюру на тэму «Зіма»: 5 сказаў з рознымі тыпамі аднасастаўных сказаў.

У з о р. З раніцы падмарозіла (безасабовы). І не дзіўна (безасабовы), гэта зіма (назыўны). Радуемся і чакаем навагоднія святы, ялінку, падарункі (пэўна-асабовы). Усім вядома: як Новы год сустрэнеш, так і правядзеш (абагульнена-асабовы).

— Уявіце сябе ўдзельнікамі блеф-клуба лінгвістаў. На рабочых аркушах прапанаваны пытанні. У апошняй графе ўпішыце адказы «так» ці «не».

**Гульня «Так ці не?»**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Пэўна-асабовыя — гэта аднасастаўныя сказы. | |
| 2 | Аднасастаўныя — гэта сказы з адным галоўным членам. | |
| 3 | Ці можна ў няпэўна-асабовых сказах аднавіць дзейнік? | |
| 4 | Ці можа быць у няпэўна-асабовых сказах выказнік у форме 1-й і 2-й асобы? | |
| 5 | Ці звязаны паняцці «безасабовы дзеяслоў» і «безасабовы сказ»? | |
| 6 | Ці можна аднавіць дзейнік у безасабовых сказах? | |
| 7 | Ці можа назыўны сказ быць развітым? | |
| 8 | Назыўныя — гэта двухсастаўныя сказы? | |
| 9 | Світае. Гэта абагульнена-асабовы сказ. | |
| 10 | Дзень цёплы, летні. Гэта аднасастаўны сказ. | |

# Змест

Прадмова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Рэзервовы ўрок. Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле «Аднасастаўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне» . . . . . . . . . . 4
Урок 33. Няпоўныя сказы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
Урок 34. Няпоўныя сказы. Працяжнік у няпоўным сказе . . . . . . . . 17
Урок 35. Паняцце пра ўскладнены сказ. Сказы з аднароднымі членамі 22
Урок 36. Сказы з аднароднымі членамі. Злучнікі пры аднародных членах сказа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
Урок 37. Аднародныя і неаднародныя азначэнні . . . . . . . . 35
Урок 38. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі . . . . . . . . 39
Урок 39. Сказы з абагульняльнымі словамі пры аднародных членах, знакі прыпынку ў іх . . . . . . . . . . . . . . . . . 48
Урок 40. Сказы з абагульняльнымі словамі пры аднародных членах, знакі прыпынку ў іх . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
Урок 41. Водгук на празаічны або вершаваны твор . . . . . . . . 58
Урок 42. Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле «Сказы з аднароднымі членамі: будова, значэнне, ужыванне» 61
Урок 43. Кантрольны дыктант . . . . . . . . . . . . . . . . 70
Урок 44. Зваротак. Неразвітыя і развітыя звароткі, іх выдзяленне ў вусным і пісьмовым маўленні . . . . . . . . . . . . . 71
Урок 45. Зваротак. Неразвітыя і развітыя звароткі, іх выдзяленне ў вусным і пісьмовым маўленні . . . . . . . . . . . . . 78
Урокі 46—47. Пабочныя словы, словазлучэнні і сказы і іх пунктуацыйнае афармленне . . . . . . . . . . . . . . . . 83
Урок 48. Устаўныя канструкцыі і іх пунктуацыйнае афармленне . . . . 90
Урокі 49—50. Кантрольны падрабязны пераказ тэксту . . . . . . . . . . 95
Урок 51. Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле «Сказы са звароткамі, пабочнымі словамі, устаўнымі канструкцыямі: будова, значэнне, ужыванне» . . . . . . . . . 97
Урок 52. Паняцце пра адасабленне. Адасобленыя дапасаваныя і недапасаваныя азначэнні . . . . . . . . . . . . . . . . . .103
Урок 53. Адасобленыя дапасаваныя і недапасаваныя азначэнні . . . . .107
Урок 54. Сказы з адасобленымі прыдаткамі, знакамі прыпынку ў іх 113
Урокі 55—56. Сказы з адасобленымі дапаўненнямі, знакамі прыпынку ў іх . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .119
Урок 57. Сказы з адасобленымі акалічнасцямі, знакі прыпынку ў іх . .125
Урок 58. Сказы з адасобленымі акалічнасцямі, знакі прыпынку ў іх . .130

Урок 59. Сказы з адасобленымі ўдакладняльнымі членамі сказа, знакі прыпынку ў іх . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 135
Урок 60. Сказы з адасобленымі ўдакладняльнымі членамі сказа, знакі прыпынку ў іх . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 140
Урокі 61—62. Кантрольная тэставая работа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 144
Урок 63. Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле «Сказы з адасобленымі членамі: будова, значэнне, ужыванне» 154
Урок 64. Падрыхтоўка да сачынення-апісання помніка гісторыі (культуры) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 160
Урок 65. Параўнальны зварот. Знакі прыпынку пры параўнальным звароце . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 165
Урок 66. Параўнальны зварот. Знакі прыпынку пры параўнальным звароце . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 169
Урок 67. Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год . . . . . . 174
Урок 68. Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год . . . . . . 179

Спіс выкарыстанай літаратуры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 185